Газета для вас

30 сакавіка — 5 красавіка 2001 г.

№ 13 (276)

Грамадска-палітычны штотыднёвік, выдаецца са студзеня 1997 года

ІВАЦЭВІЧЫ-БАРАНАВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ-ДРАГІЧЫН

● *1 КРАСАВІКА — ДЗЕНЬ СМЕХУ*

ДАЧАКАЛІСЯ?!



Калаж Андрэя БЯЛЬКЕВІЧА.

ІВАЦЭВІЧЫ. Тут, на плошчы ля Дома Саветаў, прызямліўся самалёт. Адны кажуць, нехта звышважны прыляцеў, другія — зарплату прывезлі, будуць павышаць да 100 долараў, а трэція — паціскаюць плячыма...

ЧАСТНЫЕ ОБЪЯВЛЕНИЯ

☞ Продается 2-комнатная квартира в г. Ивацевичи, 2-й этаж кирпичного двухэтажного дома, телефон, балкон. Тел. в г. Ивацевичи 2-36-20.

☞ Продается мопед газовый в хорошем состоянии. Тел. в г. Ивацевичи 2-57-33.

☞ Продается 2-комнатная квартира в г. Ивацевичи. Тел. 2-14-91 (после 18.00).

☞ Продается мягкий уголок "Ивушка", новый, цена договорная. Тел. в г. Ивацевичи 2-14-44, звонить с 17.00 до 21.00.

☞ Продаются немецкая швейная машина в исправном состоянии, кормозапарник, сварочный аппарат б/у. Тел. в Ивацевичском р-не 43-3-87.

ЧАС РЭСПУБЛІКІ

Колхозники Брестчины останутся без зарплаты

Руководство Брестской области приняло решение не выплачивать зарплату в колхозах и совхозах Брестчины до окончания весенне-полевых работ.

Эти деньги, по словам председателя облсовета Леонида Лемешевского, будут направлены на закупку топлива. Кроме того, для этих же целей в мартемае со всех хозрасчетных предприятий и организаций Брестчины будет взиматься 1 процент от выручки.

В Брестской области сложилась критическая ситуация с топливом, удобрениями и средствами защиты растений. Нехватка топлива зимой тормозила вывоз на поля органики, которой вывезено 71 процент к уровню прошлого года, а заготовлено 84 процента от необходимого. Минеральных удобрений имеется лишь около 40 процентов к потребности, средств защиты - 28 процентов, а в 133 хозяйствах они вообще отсутствуют.

По словам Леонида Лемешевского, сельчане с пониманием отнеслись к решению руководства области не выплачивать им зарплату.

Задержаны участники митинга

По данным Главного управления внутренних дел Минского горисполкома, 25 марта в Минске были задержаны 12 участников несанкционированных шествия и митинга по случаю празднования 83-й годовщины образования Белорусской Народной Республики.

На всех их сотрудники милиции составили протоколы о совершении административного правонарушения, затем пять человек были отпущены, а семь - помещены до суда в спецприемник-распределитель на улице Окрестина.

В то же время, как сообщил БелаПАН пресс-секретарь МВД республики Дмитрий Партон, задержанных было не 12, а 13 человек. Возможно, отличие данных ГУВД и МВД связано с тем, что один из задержанных был несовершеннолетним, которого после задержания просто передали родителям.

В Гродно избит журналист

25 марта в Гродно, в День Воли, сотрудниками милиции был избит корреспондент негосударственной городской газеты "Биржа информации" Дмитрий Егоров.

Как сообщили БелаПАН его коллеги из редакции, это произошло перед началом митинга в честь 83-й годовщины провозглашения БНР. Журналист приступил к исполнению служебных обязанностей за полчаса до начала сбора участников акции. Увидев скопление спецавтотранспорта для перевозки заключенных, Дмитрий Егоров отснял два кадра. Его тут же схватили несколько работников милиции, отобрали фотокамеру и потащили в машину.

После обыска Дмитрий, которому еще не исполнилось 18-ти лет, трижды подвергся избиению: сотрудники милиции били его руками и ногами, в том числе по голове. На требования журналиста назвать фамилии милиционеров, они оскорбляли его и угрожали преследованием. В конце концов, Дмитрия подвезли к зданию местной тюрьмы, показали, куда его могут посадить, после чего, отдав поломанный фотоаппарат и диктофон, отпустили.

Правлением А. Лукашенко удовлетворены не все

"Удовлетворены ли Вы тем, как А. Лукашенко управлял страной в течение шести лет?" - с таким вопросом обратились к жителям Беларуси сотрудники Независимого института социально-экономических и политических исследований (НИСЭПИ), а также Центра социальных и экологических исследований в ходе опроса, проведенного в феврале-марте.

На анкету ответило около 1500 человек. 41 процент из них заявили, что они отчасти удовлетворены, а отчасти не удовлетворены тем, как А.Лукашенко управлял государством. 29 процентов респондентов скорее удовлетворены и такое же количество (29 процентов) скорее не удовлетворены руководством Беларусью со стороны Лукашенко. И лишь единицы (1 процент) затруднились ответить на предложенный вопрос.

Будем голосовать?

76,1 процента белорусских граждан намерены принять участие в президентских выборах осенью 2001 года.

Такие данные содержатся в последнем национальном опросе, проведенном Независимым институтом социально-экономических и политических исследований (НИСЭПИ) в феврале – марте.

Еще 10,8 процента граждан, согласно опросу НИСЭПИ, примут решение об участии или неучастии в голосовании в зависимости от политической обстановки во время предвыборной кампании. И только 6,5 процента заявили, что не будут принимать участие в выборах.

(БелаПАН).

Добрая магчымасць

Як выжыць сёння сельскай гаспадарцы ў цяжкіх эканамічных умовах?

На гэта пытанне, думаецца, можа адказаць Уладзімір Паўлавіч Хілько, старшыня калгаса "Новы шлях" Драгічынскага раёна. Зорак, як кажуць, ён з неба не хапаў, а разам з людзьмі працаваў і працуе на зямлі. Леташнія паказчыкі гавораць самі за сябе: калгас выйшаў пераможцам у раённым спаборніцтве па вытворчасці малака і мяса. І ў гэтым годзе, дзякуючы добрай кармавой базе, нарошчвае вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі. Па выніках працы за першыя два месяцы года знаходзіцца ў ліку перадавікоў раёна.

Па словах галоўнага заатэхніка гаспадаркі С. Я. Шальпука, надой на адну карову ў студзені склаў 257 кілаграмаў малака, на 12 кілаграмаў больш, чым летась у такі ж перыяд. Зараз кожная галава буйной рагатай жывёлы на адкорме і дарошчванні папраўляецца за суткі на 400 грамаў. Гэта на 65 грамаў больш, чым у студзені мінулага года.

У зімовы час у калгасе ад кожнай каровы надойвалі штодзённа звыш дзесяці кілаграмаў малака. Гэта нядрэнны паказчык, калі ўлічыць той факт, што па раёне ён складае толькі 3,58 кілаграма.

Ці можна мець лепшыя паказчыкі? Жывёлаводы Застаўскай фермы гэтага калгаса надойваюць у дзень ад каровы 11,4 кілаграма малака. А маладняк на дарошчванні (маецца на ўвазе кожная галава) прыбаўляе ў вазе за суткі 462 грамы.

Чым жа забяспечваюцца такія паказчыкі? На той жа Застаўскай ферме сутачны рацыён адной каровы наступны: 20 кілаграмаў высакаякаснага кукурузнага сіласу, 3 — саломы, 10 — кармавых буракоў, 0,5 кілаграмаў жамерыну і 200 грамаў канцэнтратаў на адзін літр надоенага малака. Падлічана, што такі рацыён складае каля дзесяці кармавых адзінак.

Як бачым, якая кармавая база, такая і аддача. Гэта, па-першае.

А па-другое, любы поспех забяспечваюць людзі. Старанныя, працавітыя, дбайныя. Можа, не ва ўсіх аднолькава атрымліваецца, але адчуваецца, што кожны жывёлавод сумленна адносіцца да сваёй справы.

Напрыклад, кожны гадаванец цялятніцы Н. П. Мухі папраўляецца за суткі больш як на 700 грамаў. З гордасцю можна гаварыць пра даярку Р. І. Карнік, якая летась ад кожнай каровы сваёй групы надаіла па 4133 кілаграмы малака.

Антон ХВЕДАРЧУК.
Драгічынскі раён.

Блізіцца пасяўная...

ІВАЦЭВІЧЫ. Ідзе вясна — блізіцца пасяўная. Баліць галава ў калгаснікаў, у кіраўнікоў рознага рангу раёна: дзе ўзяць патрэбную колькасць гаруча-змазачных матэрыялаў для яе правядзення. У райвыканкаме вырашылі: 70 працэнтаў даведзенага гаразліковым прадпрыемствам задання па нарыхтоўцы сена (400 кг на аднаго працуючага) кампенсаваць гаспадаркам грашыма ўжо цяпер з разліку 30000 руб. за 1 т. Здабытыя такім чынам грошы накіраваць на набыццё ГЗМ. А сена? Да касавіцы яшчэ далёка, нешта прыдумаецца. Эх!..

Пакуль на ГЗМ сабрана прыблізна 10 мільёнаў рублёў.

Алесь ГОМАН.

Імідж горада

БЯРОЗА. Апошнім часам у сувязі з заняткамі Народнага ўніверсітэта нярэдка даводзілася сустракаць ды праводзіць з Бярозы гасцей са сталіцы. Многія з вялікай прыязнасцю выказваліся пра горад як даволі чысты, утульны, з прывабнымі крамамі. Але часта ўражанне псавала развітанне. Бо едучы на аўтамабіле на чыгуначны прыпынак, яны вымушаны былі адзначыць, што для такога ва многім дагледжанага, прыгожага горада, неяк крыху няёмка не мець нармальнага пад'езду да чыгункі. Гэта — госці.

А што казаць пра саміх бярозаўцаў, якім значна часцей даводзіцца сустракаць ды выпраўляць родных, знаёмых. Ды тое ж, напэўна, тычыцца і самих кіраўнікоў раёну.

Зразумела, што пры сённяшнім "эканамічным росквіце" мясцовага бюджэту ніяк не хапае на тое, каб залатаць усе дзіры. Але ж для таго, каб вырашыць нейкае пытанне, яго спачатку трэба паставіць.

Сяржук РУСЕЦКІ.



Дело было так..

БАРАНОВИЧИ. Недавно районный отдел милиции провел операцию, в результате которой остановлена деятельность одной подпольной криминальной структуры, которая занималась скупкой цветных металлов. Лом складировался в пустующих гаражах 120-й мехколонны, которая находится недалеко от мотеля "Нептун" и деревни Звездное.

Преступники были задержаны как раз в тот момент, когда машина примерно с 4 тоннами цветного металла готовилась к отправке. Груз конфискован.

Да будет свет бесплатным!

БАРАНОВИЧИ. Некоторые жители Барановичского района видимо решили, что наступил коммунизм и платить за электроэнергию уже не нужно. Это явление приобрело прямо-таки повальный характер, что энергетики уже не раз обращаются за помощью к суду. Так, некая Федорова из д. Подлесейки не платила за электроэнергию с 25 августа 1998 года. Еще один житель района Т. М. Сасим безучетно подключил электроэнергию с ввода в дом. Суд, естественно, не погладил их по голове. Придется оплатить теперь все: и электроэнергию, и штраф, и судебные издержки.

Галина САСИМ.

Отберут лицензию?

ПРУЖАНЫ. Недавно из-за жалоб граждан на низкое качество нефтепродуктов, отпускаемых через АЗС коммерческих структур концерном "Белнефтехим", оперативно были организованы проверки. В результате на АЗС в Пружанах, принадлежащей кооперативу "АСТ" и в Березе на АЗС, принадлежащей ОАО "Берёзаагроснаб", обнаружено смешение автобензина с дизельным топливом. Согласно постановления Совета Министров РБ от 4.08.99 г. за №1215 нарушителям грозит приостановление действия лицензии.

Екатерина НОВИК.

РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

Цэны на рынках нашага рэгіёну па стану на 28.03.2001 г. (у руб. за адзін кілаграм):

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны	Драгічын
Свініна	2500	2500—4000	2500—3600	2500—3500	2450—3000
Сала салёнае	1900—2500	1800—2800	2500	2600	2400—2600
Алей (1 л)	750—1000	700—1100	750—950	800—1100	900—1200
Яйкі	750—900	900—1000	800	800	1000—1110
Малако (3 л)	600	600	600	600	670
Шпроты	450	400—420	450—480	400—450	550
Масла сметанк.	1900	2000	2000	2000	2000—2050
Бульба	80—100	100—120	100	100—120	110—120
Цыбуля	200	220	250	200	250
Морква	200	200—300	180	180	180—190
Капуста	100	300	80—200	100—120	120
Грушы	1600	600—1000	—	1400	—
Буракі	60—80	120—140	60—80	80	85
Мандарыны	1900—2300	2000—2200	2000	1800—2100	1800
Грэцкія арэхі	1800	2000	1500	1300—2100	1700
Яблыкі	400—650	450—800	400—600	420—500	400—550
Маянэз	250—450	240—420	250—420	240—450	310—500
Вінаград	4000	3800—5000	4000	—	—
Агуркі	1400	1200—1300	1300	1400	—
Часнок	1600	1800	1000	1000	750—810
Лімоны	1450—1500	1400—1600	1700	1450	1400
Апельсіны	1200—1400	1200—1300	1300	1400	1300
Бананы	1200—1400	1000—1200	1200	1450	1200
Гранаты	1900	1900	1800	1600—1800	1900
Грэчка	550—600	650	550—600	700	600
Макар. вырабы	520—560	500—560	550	500—600	600—650
Рыс	500—540	500—520	550	540	600
Манныя крупы	500	460	500	500	530—540
Проса	320—350	330	380	400	380—410
Цукар	580	600	600	—	600
Мёд	4.000	4,000	3,600	4.000	3.900-4.100

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ (руб.)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	1350	1400	1350	1400	1350	1400	—	—	1310	1340
1 дойчмарка	590	600	580	610	580	610	—	—	585	610
1 рубель Расіі	43	—	44	46	44	49	—	—	45	48

ДЕНЬ ВОЛИ В МИНСКЕ

Лидеры объединенной оппозиции Винцук Вячорка, Анатолий Лебедько, Алексей Король считают, что власти Беларуси нарушили договоренности о мирном проведении Дня Воли, достигнутые накануне во время переговоров с министром внутренних дел Беларуси. Это привело к насилию, задержаниям и избиениям десятков людей.


IREX/ProMedia.

Солдаты внутренних войск перекрыли проспект Машерова во время акции оппозиции, посвящённой Дню Воли. Минск, 25 марта 2001 г.

По словам председателя БНФ Винцука Вячорки, с министром внутренних дел Владимиром Наумовым, лично присутствовавшим на демонстрации и митинге, перед началом акций был достигнут компромисс, суть которого была в том, что колонна демонстрантов двинется по улицам Танка - Дрозда и затем на площадь Бангалор. В процессе шествия организаторы решили сократить маршрут: в районе пересечения улицы Дрозда и проспекта Машерова провели короткий митинг и призвали людей разойтись, чтобы продолжить празднование в форме народных гуляний на площади Свободы. "То, что произошло после, не поддается рациональному объяснению. Сам Наумов пробовал строить людей, отбирал у кого-то мегафон. Мы слышали, что отдаются противоречивые приказы и в результате различные милицейские подразделения, внутренние войска действуют несогласованно. С нашей стороны было сделано все, чтобы продемонстрировать мирные намерения. Мы не поддавались ни на какие провокации, мы не прорывали кордоны, а всего лишь подошли к стеле в честь победы в Великой Отечественной войне. И в ответ получили зачистку и хапун. То, что произошло 25 марта, - это поражение власти. Они повели себя неадекватно, нерационально, показали, что не могут цивилизованно обращаться с мирными людьми", - сказал Вячорка.

Председатель Объединенной гражданской партии Анатолий Лебедько считает, что события 25 марта продемонстрировали неизменность антидемократической позиции белорусских властей. "Вчера было также продемонстрировано, - считает Лебедько, - что у власти нет той поддержки народа, рейтинга в 40-45 процентов, о котором они постоянно заявляют. Располагая такой поддержкой, власть могла бы разрешить оппозиции свободно провести мероприятия в центре города".

БелаПАН.

Это была провокация

Руководители БНФ Винцук Вячорка и Объединенной гражданской партии Анатолий Лебедько осудили сожжение флага Российской Федерации в ходе проведения мероприятий в День Воли 25 марта.

Лидер ОГП Анатолий Лебедько сказал, что партия приняла заявление, в котором факт сожжения российского флага расценивает как провокацию. "Сожжение флага не является позицией Объединенной гражданской партии и ее сторонников. На наш взгляд, бороться за свою национальную символику, сжигая символы других стран, очень непродуктивно", - сказал Лебедько.

По словам председателя БНФ Винцука Вячорки, эпизод с сожжением флага не входил ни в какие сценарии и планы организаторов празднования Дня Воли. "Возглавляемая мной организация не имеет к этому никакого отношения. Следует отметить, что организационно подобные эпизоды тяжело предотвратить.", - сказал Вячорка.

БелаПАН.

Первые суды

26 марта в суде Центрального района Минска состоялись первые суды над участниками празднования Дня Воли в Минске 25 марта.

Всего в суд было доставлено из спецприемника-распределителя и прибыло по повесткам 12 человек. Рассмотрено 3 административных дела.

Судья Наталья Войтехович признала 20-летнего Дмитрия Чубаренко, участника несанкционированной демонстрации и митинга в День Воли, нарушившим общественный порядок (статья 167-1 часть 2 Кодекса об административных правонарушениях). Судья вынесла постановление об административном аресте Чубаренко на 10 суток.

Депутат Верховного Совета 13-го созыва Людмила Грязнова оштрафована на 20 минимальных зарплат. Преподавателю одного из минских вузов доценту Виктору Бекишу вынесено предупреждение.

Рассмотрение дел 9 человек перенесено на другие дни. Дело председателя БНФ Винцука Вячорки будет рассмотрено 28 марта, руководителя правозащитного центра "Вясна" Алеся Беляцкого - 2 апреля.

БелаПАН.

Пришлось поработать на немцев

Все, о чём я хочу рассказать, началось в июне 1943 года. Именно в это время моя семья, до войны проживавшая в Витебске, оказалась в фашистском трудовом семейном лагере, который находился около Барановичей. Сейчас это место уже в черте города и находится в Северном микрорайоне. Я, мои братья, мать и бабушка были привезены в этот лагерь вместе с другими. Нас везли в товарных вагонах на Запад, но в Барановичах два вагона отцепили. И человек 100-120 оказались в так называемом лагере. Он представлял собой ров шириной 12-15 метров, глубиной до 4 м, на дне которого находились фанерные бараки. Лагерь был обнесён колючей проволокой и охранялся немцами. Наверху располагалась немецкая фирма по ремонту и строительству железных дорог и мостов. Под руководством немцев узниками была построена узкоколейка, по которой ходил паровоз с вагонетками. В них возили песок, щебень и расширяли насыпь за переездом (ныне это станция Северная). На строительстве этой насыпи заставляли работать взрослых и детей старше 10 лет. Мне тоже пришлось там гнуть спину, работа была очень тяжёлая, а кормили плохо, как скотину: вода, заправленная мукой, в которой плавали несколько кусков картофеля. Так и жили, да ещё и мерзли прилично. Зимой стены фанерного барака промерзали насквозь, хоть там и стояла буржуйка, но тепло было только рядом с ней. Дети страшно болели, умирали. Неизвестно, остался бы кто-то жив, если бы не события 1944 года, когда немцы, всё побросав, кинулись наутёк. А нас Бог миловал, остались живы.

После освобождения все бывшие узники остались жить там, где и жили до сих пор, только вместо бараков построили землянки. Наверху, где были постройки немецкой фирмы, расположилась наша дальнобойная зенитная батарея, состоявшая из девушек-зенитчиц.

Осенью 1944 года я пошёл в школу, во второй класс. Через год нашей семье дали комнату в городе, на улице Мицкевича, 33. Мать добилась человеческого жилья через военкомат, поскольку наш отец был офицером и воевал на фронте. А многие долго ещё жили в землянках на месте бывшего лагеря. Например, нашим знакомым Дегтярёвым квартиру дали только через 8 лет. Это случилось по распоряжению тогдашнего секретаря горкома партии Аджимамедова. Все землянки были ликвидированы и людям дали жильё.

Мне хорошо запомнился ещё один эпизод. Возле нашего лагеря были расстреляны 3 тысячи евреев. Я видел, как раскапывали захоронение. Взрослые и дети лежали штабелями. Члены военной комиссии извлекали документы и другие бумаги. Немного позже на этом месте был установлен памятник погибшим, а впоследствии захоронение перенесли в урочище Гай.

Такова моя жизненная трагедия. А проблема в том, что бывший фашистский семейный лагерь нигде не числится, о нём не знают, и я не имею статуса узника. Почему так получилось — даже не знаю. Городские власти должны были бы узнать и о лагере, и о его месте расположения, ведь именно они давали нам жильё в городе. Есть немало узников, которых я помню и могу назвать фамилии. Мимо нашего лагеря в базарные дни часто проезжали крестьяне из разных деревень. Они тоже должны помнить о существовании лагеря. Дети из Колпеницы мимо нас ходили в городские школы, они тоже знали о лагере. Тогда почему о нём не знают или не хотят знать власти? Ищу ответ на этот вопрос и надеюсь найти.

Евгений СЕРПУХОВИТИН.
г. Барановичи.

Часто ли вы смеётесь?

На этот вопрос отвечают жители г. Ивацевичи и района



ОЛЕГ: Часто. Особенно, когда сойдёмся с моим другом Сергеем. А если серьёзно, то в этой жизни приходится больше унывать, чем смеяться.



МАРИЯ: Знаю, что смех продлевает жизнь и улучшает здоровье. Но в жизни больше грустного, чем смешного, поэтому смеяться приходится не часто.



АНАТОЛИЙ: Говорят, смеяться — не грех. Смеюсь, когда по телевизору показывают передачу "Аншлаг". Хорошее настроение у меня бывает...



НАТАЛЬЯ: Смеюсь каждый день. Бывают всякие ситуации. Уныние — это хуже, чем смех. Поэтому, не дожидаюсь 1 апреля, чтобы вдоволь насмеяться.



НИКОЛАЙ ВЛАДИМИРОВИЧ: Смех — это хорошее дело, это полезно для здоровья. Хорошо, что есть день смеха. Был бы он ещё выходным...



ТАМАРА: У меня хорошая, дружная семья. Мы часто смеёмся, часто шутим. В этой жизни трудно не смеяться. Много кругом смешного.

В народ ходили Святослав КОЖЕДУБ, Андрей МАЦУКЕВИЧ (фото).

РОЖДЕННЫЙ ЛЕТАТЬ

МОЖЕТ И ЗЕМЛЮ ПАХАТЬ

Николай Иванович Дацкевич хорошо известен на Пружанщине. Он единственный фермер в районе, который занимается садоводством, к тому же — на высоком профессиональном уровне. Но "зеленые хлопоты" занимают Н. И. Дацкевича только семь последних лет.

До того как спуститься на землю, Николай Иванович летал. В прямом смысле — служил прапорщиком вертолетной авиабазы. А в 1994 году решил заняться фермерством. Когда-то Пружанщина славилась своими садами, и мечтал Дацкевич возродить эту славу. В том же году Николай Иванович как фермер получил в аренду землю. Земля эта имела очень малый процент гумуса, и комиссия из восьми профессоров признала её непригодной для ведения сельского хозяйства. Однако фермер Дацкевич заложил свой сад, который впоследствии прославил его не только на всю республику, но и за её пределами: по приглашению Николай Иванович побывал в Варшавском институте садоводства.

Но как далось это признание! Ежегодно в свою землю фермер вкладывал в три, а то и в пять раз больше средств и труда, чем средний колхоз. Землю через семь лет такой обработки уже не назовешь "непригодной для ведения сельского хозяйства". Каждая партия саженцев плодовых деревьев идет нарасхват. Как вспоминает Николай Иванович, однажды с ним произошел курьезный случай. В 1998 году его фермерское хозяйство "Зубр" было приглашено на 9-ю Международную выставку "Минскэкспо". За два часа 6 тысяч привезенных Дацкевичем саженцев были раскуплены, и, когда пришли журналисты БТ, чтобы сделать репортаж, то увидели только сломанные напиравшей толпой ограждения.

Однако в жизни фермера таких радостных моментов пока мало. Скорее наоборот — приходится видеть равнодушие к садоводству и огородничеству.

Обратился Николай Дацкевич в хозяйство "Остромечево" с предложением приобрести у него саженцы по доллару за штуку (при себестоимости 2,4 доллара), в ответ — отказ. Или такой еще пример. В прошлом году получил фермер хороший урожай ранней капусты. Предложил её местному заводу, выпускающему плодоовощные консервы. Предложил без предоплаты, расчет после реализации продукции. Однако директор завода посчитал выгодным завезти капусту из Бреста, где и закупил 300 тонн. А Дацкевич вынужден был отборный урожай с площади в 2,5 га закопать в землю.

Есть вопросы у Николая Ивановича и к властям. Почему неодинаковые требования к фермерам? Почему одни выкладываются полностью, а у других земля целину напоминает? Ведь из-за таких "хозяев" и бытует в народе нехорошая слава о фермерстве.

Сегодня фермерское хозяйство "Зубр" крепко стоит на ногах. Уже сейчас, утверждает Дацкевич, у него проданы саженцы за 2002 год. А добиться такого успеха помогла фермеру разработанная им технология садоводства. По мировым стандартам период от косточки до готового саженца длится не более 40 месяцев. У Николая Ивановича эти сроки сокращаются до 1,5 года, то есть в 2,5 раза.

В будущем планируется расширение хозяйства. Кроме садоводства Николай Иванович будет заниматься и разведением декоративных растений.

Ежедневно к Дацкевичу приезжают люди. И каждый получает консультацию. "А как же иначе? — объясняет фермер, — ведь люди могут из-за неведения допустить ошибку и получить не тот результат". А свой авторитет Николай Иванович бережет как зеницу ока.

Сергей КОЗЛОВ.
г. Пружаны.



Н. Дацкевич (слева) и А. Садовский, профессор Варшавского института садоводства.



Такую землю получил фермер Николай Дацкевич в аренду.



А вот такой она стала через несколько лет.

Ці бясплатная наша медыцына?

У савецкія часы лічылася, што ў нас самая передавая ў свеце медыцына і пры тым, як галоўная заваёва развітога сацыялізма, бесплатная для народа.

Ужо сёння ўсім зразумела, што ў развіцці медыцыны мы далёка адсталі ад "гнілога капіталізму". Што ж тычыцца бясплатнасці, то яе і тады не існавала. Уся медыцына аплочвалася за кошт падаткаплацельшчыкаў. Як жа тут можа павярнуцца язык і сказаць, што ўсё было задарма. Але ж гаварылі, ды яшчэ як, маўляў, усё для чалавека, для яго дабрабыту, для яго здароўя.

Чытаем у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (артыкул 45): **"Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантавана права на ахову здароўя, уключаючы бясплатнае лячэнне ў дзяржаўных установах аховы здароўя. Дзяржава стварае ўмовы для даступнага для ўсіх грамадзян медыцынскага абслугоўвання".**

А што ж на самай справе?

Грошай з бюджэту, які фарміруецца са сродкаў, выплачваемых падаткаплацельшчыкамі, для аховы здароўя зараз выдзяляецца зусім мала. Плаці падаткі, а яшчэ і за ўсё медыцынскае абслугоўванне: лекі, працэдуры, матэрыялы і нават само лячэнне.

Гэтая "бясплатнасць" ужо дайшла да самай глыбокай правінцыі. Просты чалавек успрымае гэта як абразу. Бо гаворыцца адно, а на справе — зусім іншае. У Драгічыне, напрыклад, спярша абураліся, потым здзіўляліся, а цяпер разводзяць рукамі і задумваюцца над "клопатамі" дзяржавы аб здароўі людзей.

Адну з жыхарак горада, напрыклад, якой патрэбны тэрміновы здымак галавы (бо раптоўна стала невыносна балець), паставілі на чаргу і трэба было чакаць больш як два месяцы. Калі б не родзічы, якія павезлі хворую ў сталіцу, яна б даўно аддала богу душу.

Каб на месцы зрабіць такі здымак, трэба плаціць грошы. А калі грошы ёсць, то не заўсёды плёнка знойдзецца. Як у той казцы: налева пойдзеш — у пекла пападзеш, направа звернеш — у пашчы Змея-Гарыныча апынішся. І першае, і другое дрэнна.

Чаму ў тым жа Драгічыне многія жыхары лепш ідуць да платнага данціста, хаця ўжо і ў яго чарга?

Адзін з пацыентаў сказаў мне так:

— Я — рабочы. Зарплата невялікая. Адрываю грошы ад сям'і і іду лячыць зубы ў платны кабінет. Ведаю — там добры спецыяліст. Ён не адбывае свае гадзіны на працы, як іншыя, а робіць сваю работу якасна. Калі што не так — ведаю, да каго трэба звярнуцца.

Можна і далей прыводзіць прыклады сённяшняй "бясплатнай" медыцыны. Яны ніяк не накрысць простаму люду.

Галіна АЛЕКСІЕВІЧ.
г. Драгічын.



В страшной сказке не бывает такое...

Эта очень печальная история произошла в Миловидах, где проживала молодая семья: он, она и ребенок — мальчик двух с половиной лет. Крошку зовут Толей. Это невинное создание и стало предметом развернувшейся войны. Отчим (хотя по закону он даже таковым не является, ибо живет с матерью ребенка в незарегистрированном браке), которому на момент совершения преступления не было и 18-ти лет, жестоко обращался с ребенком.

Из заключения судебно-медицинской экспертизы:

на носу, на щеках ребенка 5 кровоподтеков и ссадин, на затылочной области головы — 3, на подбородке — 4, в области грудной клетки и на спине — 11 кровоподтеков, на руках — 13, на ягодицах — 14, на стопах — 4. Причинены твердым тупым предметом.

Уже из-за одного только перечисления холодеет сердце: за что так избивали малыша? И как вообще у нормального человека могла подняться рука на беззащитное создание? Красноречиво на эти вопросы отвечают материалы уголовного дела, показания самого Калюбко:



— Из-за того, что он не являлся мне родным, что часто капризничает, я иногда его бил. От дачи дальнейших показаний отказываюсь...

Оказывается, ребенок настолько боялся дядю, с которым жила его мама, что начинал плакать едва его завидев. Горе-папашу это заводило и он начинал бить ребенка. И не просто бить, а целенаправленно избивать. Вот хроника отношений "отца" и сына.

20.06.2000 г. Александр Калюбко вернулся домой. Малыш заплакал. Он поставил его в угол, да так, что ребенок разбил нос. Мать бросилась за водой — умыть сына, но умыл отчим: вылил на ребенка ведро холодной воды и ударил по лицу. (В первоначальных материалах уголовного дела проходит и иная версия этого: Калюбко так избивал мальчика, что тот потерял сознание и его пришлось отливать водой).

21.06.2000 г. Александр ударил Толю по лицу, остались синяки.

23—24.06.2000 г. Ребенка не били, ибо он находился у бабушки.

25.06.2000 г. Бил рукой по лицу, крепко дернул за ухо и бросил в кроватку. Ребенок при падении сильно ушибся.

Александр бил мальчика постоянно. Бил, когда кормил — ложкой по голове, однажды запустил тарелкой, попал в голову, пошла кровь. Как-то Светлана, мама ребенка, заметила у мальчика на ножках два округлых пятна, очень похожих на заживающие ожоги от сигареты. Спросила у своего мужа, не знает ли он, откуда эти пятна. Тот, естественно, отговорился, дескать, как-то случайно упал пепел сигаретный, он смахнул, но след остался.

Папаша-садист изо всех сил старался, совсем хотел извести несчастного ребенка. Да приехала сестра жены и увезла мальчика, чем и спасла. Дальше был суд. Судья Барановичского районного суда А. К. Кисель ограничился одним годом лишения свободы в колонии общего режима. Калюбко вроде как вину осознал, до этого у закона к нему не было претензий, но лично мне не верится в благие намерения этого человека. Только законченный мерзавец способен избивать ребенка!

Печально в этой ситуации и положение мамы малыша. Она еще очень молода, а уже столько раз успела обжечься. Мальчик был рожден вне брака, натерпелся издевательств. Светлана же, прожив год со столь недостойным человеком, каким является Александр, родила от него ребенка, еще одного мальчика. Никому неизвестно, как сложится судьба этой горе-семьи, которая и семьей-то собственно, не является. Но даже видавших виды судей эта криминальная история удивила неприкрытым цинизмом и непонятной жестокостью.

Галина СТРОЦКАЯ.
г. Барановичи.

Лідзія ЦАЛУЙКА

СУСТРЭЧА З АМЕРЫКАЙ

(Працяг. Пачатак у № 12 за 23-29 сакавіка 2001 г.).

Нацыя імігрантаў

Аднойчы я спускалася ў ліфце з 11- га паверха гасцініцы ў яе фане ўнізе. Мужчына, які зайшоў у кабіну ліфта недзе на 9-ым паверсе, шырока ўсміхнуўся, павітаўся:

— Good morning! (добрай раніцы!)

Пачуўшы маё прывітанне ў адказ, ён яшчэ ці нешта запытаў, ці сказаў мне. Давялося яго разачараваць.

— Не разумею, — сказала я і, успомніўшы той невялікі слоўнікавы запас па-англійску, якім валодаю, дадала:

— I don't speak English (я не размаўляю па-англійску).

— Russian? — тут жа запытаўся незнаёмец.

— Беларусь, — адказала я. — Беларусь!

Ён неяк разгублена ўсміхнуўся і на розныя лады паўтарыў нейкую фразу. З цяжкасцю, але я зразумела, што ён пытаецца, дзе знаходзіцца Беларусь.

— У Еўропе. Еўропа! — тлумачыла я, але мой субяседнік толькі паціскаў плячыма.

На гэтым наша размова і закончылася: мы прыехалі ў фае гасцініцы.

Горкі асадак ад гэтай мімалётнай гутаркі развеяўся хутка. Мы зразумелі, што амерыканцы наогул адносна мала знаёмы з іншымі культурамі і нацыямі. Многія ў ЗША нічога не ведаюць аб умовах жыцця і праблемах іншых народаў. Яны не надта імкнуцца ведаць геаграфію і нават бягучыя падзеі ў іншых краінах за межамі ЗША. Як правіла, амерыканцы мала надаюць значэння мінуламу. І ўсё гэта пры тым, што народ краіны называюць нацыяй імігрантаў, выхадцамі амаль з усіх краінаў свету.

Агульнавядома, што ЗША стваралася, адбудоўвалася і развівалася дзякуючы многім і многім пакаленням імігрантаў і іх нашчадкаў. І сённяшняя Амерыка працягвае прымаць больш імігрантаў, чым любая іншая краіна свету. Амерыканскае грамадства па праву лічыцца адным з самых рознародных ва ўсім свеце. Паняцце "амерыканскі народ" складаецца з мноства культурных традыцый, этнічных сімпатый, нацыянальных асабліваcцей, расавых адрозненняў і рэлігійных веравызнанняў выхадцаў з краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і іншых кантынентаў. Гэта — англічане, немцы, ірландцы, французы, італьянцы, палякі, галандцы, шведы, рускія, іспанцы, афрыканцы, кітайцы, карэйцы, індусы, мексіканцы, канадцы, гавайцы і людзі іншых нацыянальнасцяў. Індзейцы, эскімосы і алеуты (карэнныя жыхары Амерыкі) складаюць цяпер толькі 0,8 працэнта ад агульнай колькасці ўсяго насельніцтва краіны (каля 262 мільёнаў чалавек).

Аднак няправільна разглядаць Амерыку як збор розных імігранцкіх груп са сваімі этнічнымі і рэлігійнымі пачуццямі. Дзесяткі мільёнаў жыхароў краіны, якія з гонарам гавораць аб сваім этнічным паходжанні, у большай ступені амерыканцы, чым ірландцы, італьянцы, немцы, пуэртарыканцы ці рускія. Тое, што іх аб'ядноўвае, больш значнае, чым тое, што падзяляе. Гэта, у першую чаргу, любоў да Амерыкі і сапраўдныя клопаты аб яе працвітанні. Амерыканцы заўсёды мэтанакіравана працавалі і працуюць у імя сваёй будучыні.

Усё — у імя чалавека!

Памятаеце гэты лозунг КПСС, дэклараваны ёю некалькі дзесяцігоддзяў? Сумна, што ў нас ён не ажыццявіўся, а чалавек, яго здароўе і жыццё засталіся тымі каштоўнасцямі, за якія трэба змагацца (даруйце, зноў гэтая рэвалюцыйная рыторыка, цяжка нам яе пазбегнуць!) У Амерыцы ніхто ніколі не змагаўся за тое, каб нешта пабудаваць, няхай самае ўнушальнае, ці стварадзь для чалавека. Тут людзі проста працавалі.

У Сан-Францыска нам паказалі знакаміты мост "Залатыя вароты", будаўніцтва якога было завершана ў 1937 годзе. Мост звязвае дзве часткі горада (насельніцтва яго 6513000 чалавек), якія знаходзяцца на процілеглых берагах аднайменнага заліва. Мост мае самы доўгі ў свеце падвясны пралёт — 4200 футаў, альбо 1281 метр. Ён падвешаны паміж двума апорамі па 227,5 м кожная, на вышыні 67 м над залівам. Па масту праходзіць аўтамагістраль з 6-цipалосным рухам. Як і іншыя ўзоры сучаснага мостабудаўнічага мастацтва, мост "Залатыя вароты" лёгкі на від, але вельмі трывалы і вытрымлівае каласальную нагрузку. Гэтыя звесткі нам паведаміў наш перадоўчык Іў Франкьян, выхадзец з Прыбалтыкі, які жыве ў Амерыцы (а цяпер менавіта ў Сан-Францыска) з 1961 года. І трэба было бачыць, якой сапраўднай гордасцю свяціліся вочы гэтага неэтнічнага амерыканца.



Статуя Свабоды ў Нью-Йорку.

У маленькім горадзе Грынел (штат Айова, насельніцтва 8868 чалавек) прафесары і студэнты з такой жа гордасцю паказвалі каледж гуманітарных навукаў з чатырохгадовым навучаннем для асобаў абодвух полаў, пасля заканчэння якога прысвойваецца званне бакалаўра. Каледж уваходзіць у дзесятку лепшых навучальных установаў такога тыпу ў Злучаных Штатах. Да паслуг студэнтаў (а імі з'яўляюцца людзі з розных краін свету) — вялікая бібліятэка, камп'ютэрныя залы, спартыўныя пляцоўкі і корты. У каледжы рэгулярна праводзяцца выставы, тэатральныя выступленні, лекцыі, канцэрты і сольныя праграмы, спаборніцтвы.

Навучанне ў каледжы — платнае. Дарэчы, штогадовы кошт навучання ў дзяржаўных каледжах для студэнтаў, якія жывуць у студэнцкіх гарадках, складае цяпер каля 9000 долараў, у прыватных — каля 18 тысячаў долараў. Аднак дзяржава аплачвае частку гэтай сумы тым студэнтам, якія не могуць аплочваць навучанне самі. Дарэчы, Андрэю, з якім мы сустрэліся ў Грынэльскім каледжы і які лічыць сябе беларусам ды размаўляе на чыстай беларускай мове, дзяржава аплочвае палавіну кошту навучання.

Што-кольвечы пра грошы...

Ці мае магчымасць сярэдні амерыканец вучыць сваіх дзяцей у каледжах і ўніверсітэтах? Мяркуйце самі. У ЗША, калі заходзіць размова аб памерах заработнай платы, то гавораць або аб пагадзіннай аплаце работы або гадавой. Дык вось сярэдняя заработная плата складае цяпер 30-35 тысяч долараў у год. Пачынаючы настаўнік зарабляе 40-45 тысяч долараў у год, столькі ж — пачынаючы журналіст. А вось будаўнічы рабочы зарабляе 40-45 долараў у гадзіну, за васьмігадзінны рабочы дзень — 320-360 долараў. Яшчэ больш зарабляюць таксісты, вадзіцелі вялікагрузных машынаў і іншыя людзі, занятыя фізічнай працай.

— Гэта неблагія грошы, — пераконвала нас гід па Нью-Йорку. — Я жыву ў Брукліне (раён горада), дзе чалавек можа месяц пракарміцца за 100 долараў.

Ці трэба ў гэтым пераконваць беларуса, сярэдняя зарплата якога ў месяц складае 60 долараў? Эх... наша мара, абяцаная прэзідэнтам, складае 100 долараў...

